# Паміж Цной і Камароўкай

Інфармацыйны бюлетэнь кааліцыйных дэмакратычных сіл Савецкага раёна

№ 7 (2) травень 2007


**тэма нумару**

## Вайна супраць спадарожнікавых антэнаў

**Дэмантаваць спадарожнікавыя тэлевізійныя антэны, усталяваныя на фасадах жылых дамоў, патрабуюць ад жыхароў Мінска ўлады горада. Ад боязі наступстваў транслявання незалежнага каналу з Польшчы ці ад надзвычайнай развітасці пачуцця эстэтыкі ў камунальных службаў?**

Патрабаванні зняць спадарожнікавыя антэны прагучалі год таму ў Лідзе, ды пазней справа прыціхла. Але з месяц таму кампанія па прыбіранні “талерак” пачалася зноўку, і на сёння ахапіла ўсю Гродзенскую вобласць ды дайшла да Мінску. На праспекце Незалежнасці – галоўнай вуліцы сталіцы – “талеркі” ўжо паздымалі.

«Відаць, улады занепакоены тым, што ў хуткім часе пачне вяшчаць незалежнае тэлебачанне на Беларусь праз спадарожнік з тэрыторыі Польшчы. Таму ўжо зараз дадзены загады правесці так званую інвентарызацыю прыватных тэлеантэн, каб скараціць колькасць спажыўцоў незалежнай інфармацыі», – пракаментаваў барацьбу гарадзкіх уладаў з “талеркамі” былы суддзя Канстытуцыйнага суда Беларусі, доктар юрыдычных навук Міхаіл Пастухоў.

На яго думку, да вырашэння праблемы ўлады падыйдуць выбарча. Будзе праводзіцца селекцыйны аналіз карыстальнікаў спадарожнікавымі антэнамі праз адпаведную рэгістрацыю. Такім чынам зьяўляецца магчымасць ствараць перашкоды ў выкарыстанні гэтых антэн, напрыклад, грамадзкім актывістам. А грамадзянам, якія не выклікаюць засцярогі, што будуць распаўсюджваць незалежную інфар-мацыю, дазволяць усталяваць “талеркі”.

Не здзіўляе юрыста, што ўлады знайшлі праўнае абгрунтаванне сваім дзеянням. Маецца на ўвазе артыкул 21.13 новага Кодэксу аб адміністрацыйных парушэннях, які вызначае адказнасць за парушэнне фасадаў пабудоў. Паводле артыкулу, усталяванне тэлеантэнаў прыраўнавалі да афармлення фасаду гэтых будынкаў. Чыноўнікі тлумачаць, што справа толькі ў эстэтычным выглядзе гарадзкіх вуліц, і спасылаюцца на тое, што антэны ўсталявалі без узгаднення з архітэктарамі гарадзкой адміністрацыі.

Такая адвольная трактоўка закону зьяўляецца вельмі спрэчнай і прыцягнутай за вушы, – кажа М. Пастухоў. Ён лічыць, што гэтыя дзеянні ўлад супярэчаць артыкулу 34 Канстытуцыі, які



дае права грамадзянам на атрыманне, захоўванне і распаўсюд любой інфармацыі.

Пастанова Мінгарвыканкаму «Аб упарадкаванні размешчання асабовых прыемных антэнаў прграм тэлебачання з штучных спадарожнікаў Зямлі» інсуе аж з 1994 г.

«Кідаецца ў вочы, што да гэтай пары ўлада чамусці не заўважала, што антэны псуюць эстэтычны выгляд будынкаў. У такім выпадку трэба патрабаваць ад грамадзян наводзіць парадак у цэлым на балконах. Але тут можна дайсці да поўнага абсурду, – разважае прававеднаўца. – Зразумела, гэта нагода прычапіцца да спадарожнікавых антэн, менавіта ў іх уся праблема».

У пяці ЖЭСах, куды звярнулася па тлумачэнні карэспандэнтка “БелГазеты”, пацвердзілі, што патрабаванне “разабрацца” з антэнамі сапраўды “спусцілі сверху” месяц таму.

Незалежнае спадарожнікавае тэлебачанне для Беларусі пачнуць трансляваць з Польшчы ўжо ад сярэдзіны кастрычніка. У праграме тэлеканалу “Белсат” мусіць быць 17 уласных праграмаў, выпускі навінаў.

«Ужо шматкроць падкрэслівалі, што мэтай праекта – умажлівіць беларускую аўдыторыю атрымліваць незалежную інфармацыю. Бо пераважна праз тое, што ў Беларусі дзяржаўная манаполія ў сферы СМІ, ня маючы доступу да альтэрнатывы, людзі ня могуць зрабіць свядомы выбар», – сказала каардынатарка праекту тэлеканала А. Рамашэўска.

Словы журналісткі пра доступ да незалежнай інфармацыі выразна пацвярджаюць вынікі даследванняў спецыялізаваных арганізацыяў. Гэтак, менш як месяц таму міжнародная арганізацыя Freedom House, што займаецца абаронай журналістаў, апублікавала рэйтынг свабоды прэсы ў краінах свету. Паводле яго, Беларусь займае 186-ае месца з 195 краінаў, апынуўшыся ў спісе паміж Самалі і Экватарыяльнай Гвінеяй.

Лукашэнка тэлевізійны праект назваў «глупым, бестолковым и недружественным». Па ўсім відаць, уладныя колы ўсведамляюць сабе небяспеку ад транслявання непадкантрольнага дзяржаўнай цэнзуры тэлеканалу. Таму імкнуцца знішчыць яшчэ адну крыніцу незалежнай інфармацыі – спадарожнікавае тэлебачанне.

**Гудовіч Андрэй**

**рэзананс**

## КДБ ня прызнае факт растрэлаў

Цуды неведзі прадэманстраваў давечы КДБ Беларусі. Тым часам як усё грамадзтва звонка б’е ў званы ў памяць аб масавых растрэлах уначы 30 кастрычніка 1937 г. прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі, самая быццам бы інфармаваная структура сцвярджае, бы ёй анічога пра гэты факт не вядома.

Менавіта пра гэта гаворыцца ў лісце кіраўніцтва КДБ да сустаршыняў грамадзкага аргкамітэту ў справах ушанавання памяці ахвяраў рэпрэсій за часамі сталінізма.

Паводле сустаршыні аргкамітэту гісторыка Ігара Кузняцова, падобны адказ стаў адповедзю КДБ на запытанне раскрыць месцы пахавання 69 прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі, расраляных супрацоўнікамі НКВД у памянутую ноч.

– Дзіўную маем карціну: грамадзкасць пра гэты факт ведае, а яны не, – дзівіцца І. Кузняцоў. – Неяк ня стыкуецца з статусам арганізацыі, якая ведае ўсё. Я канечне магу змеркаваць, што ў выніку колькіх чыстак архіваў КДБ – а чысткі гэткія праводзілі аж да гарбачоўскай перабудоўлі – асобныя дакументы маглі знікнуць. Але ж ня думаю, што ўзнавіць іх цяжка. Мы, гісторыкі, ня раз прапанавалі КДБ сваю дапамогу ў шуканні згубленых свідоцтваў, прычым абсалютна бясплатна. Ды як выявілася, дапамогі аніякая ім ня трэба. Сумнявацца ня выпадае: ёсць звычайны загад аніякіх архіваў не раскрываць і факту растрэлаў ня прызнаваць.

Нагадаем, што адно з месцаў масавых пахаванняў ахвяраў сталінскага рэжыму якраз на тэрыторыі нашага раёну, у ўрочышчы Курапаты. Тут у 1937-1941 гг. супрацоўнікі НКВД расралялі да 250 тысяч жыхароў Беларусі.

По матар’ялах газеты “Салідарнасць”, **www.gazeta.by**

**в районе**

## “Трубный” вопрос на локальном уровне

Более двух месяцев продолжаются ремонтные работы по укладке труб в одном из кварталов нашего района, находящемся между улицами Сурганова, Некрасова, Беды и Богдановича. Заметим, ведутся лишь де-юре.

Исполнитель проекта “Минсктеплосети” не спешит выполнять заказ концерна Белэнерго. Согласно документации, ремонтные работы должны закончится до конца года. Вместе с тем, директор КУП “ЖЭУ-85” Сергей Малейкович выразил сомнение, что и в эти сроки строительный проект реализуется.

Несколько лестничных переходов, сооруженных поверх пролегающих на поверхности труб, находятся в очевидно аварийном состоянии. Поэтому жители квартала с маленькими детьми, люди престарелого возраста вынуждены в целях собственной безопасности обходить аварийные участки переходов окольными



*фото:Борисов А.*

путями, в том числе через дворовые арки.

Редакция газеты поможет жителям квартала, ставшим заложниками системы, объединить совместные усилия для разрешения сложившейся ситуации. Желающих участвовать в процессе сбора подписей среди жителей квартала, просим связаться с редакцией бюллетеня.

**Гудовіч Андрэй**

**Шаноўныя чытачы!**

Рэдакцыя бюлетэню апякуецца вашымі прапановамі наконт зместу наступных нумароў.

Свае артыкулы, водгукі й пажаданні, паведамленні й заўвагі просім дасылаць на электронную скрыню **Kamarouka@gmail.com**

Бясплатную падпіску замаўляйце па тэлефоне: **+375299029516**

З павагай, калектыў “ПЦК”

**www.kamarouka.org**